**Цэна асобнага нумэру 5 кап.**

# НАША НІВА

Выходзіць што тыдзень.

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі: **Вільня, Віленская вул., № 29.**

Цэна с перасылкай і дастаўкай на 1 г.—2 р. 50 к., на 6 мес.—1 р. 25 к. на 3 м.—65 к., на 1 мес.—25 к. За граніцай: на 1 г.— 4 р. на 6 мес —2 р. 3 мес.—1 р. Перамена адрэсу—20 кап.

Абвесткі прыймаюцца на апошняй страніцы па 20 кап. за лінейку малымі літэрамі Рукапісы і карэспандэнції, присланые у рэдакцію, павінны быць чытэльна напісаны с праўдзівай фаміліей і адрэсам таго, хто яе прысылае. Можна такжэ падпісаць прозвішчэ разам з фаміліей, хто ня захочэ каб была надрукавана праўдзівая фамілія. Адрэс і фамілія тэлькі для ведама рэдакції. Рэдакція пакідае за сабой права папраўляць і укарачываць прысланые рукапісы і аўторам назад іх не звертае.

Год IX. 15 Жніуня 1914 г. № 32

**Прыймаецца далей падпіска на „Нашу Ніву" на 1914 г.**

Цэна на год—2 р. 50 кап., на 6 мес.—1 р. 25 к., на 3 мес.—65 к., на 1 мес.—25 кап.

*Адрэс: Вільня, Віленская 29.*

## Вялікая бітва.

— —

У Бэльгіі, паміж французскім і нямецкім войскам, пару дзён таму, пачалася вялікая бітва. Фронт бітвы цягнецца у шыркі на дзесяткі вёрст, у ей прыймаюць учасьця мільёны людзей. І аднача гэта ня ёсць тая разстрыгаючая бітва, пасьля каторай можна мяркаваць хто каго здужаў. А ня ёсьць яна разстрыгаючай таму, што фронт арміі лішне шырокі,— цягнецца ён доўгім ланцугом ад Мозэля да Монса і, то там то сям, ланцуг гэты лопаецца то ў адну, то ў другую старану. Усё-ж такі, як дагэтуль можна мяркаваць са скупых вестак, якіе дае французскі гэнеральны штаб, справы нямецкай арміі ня лепей стаяць чымсці справы француска-бэльгійскай арміі, не глядзя на тое, што немцы атціснулі Бэльгійцоў. Праўда Бэльгійцы адступілі да Антвэрпэну, але форты крэпасці Льеж усё ешчэ дагэтуль трымаюцца ды па дарозі да Антвэрпэну перад, Немцамі стаяць дзьве бэльгійскіе крэпасці — Намюр і Діест. З гэтай прычыны правае крыло нямецкай арміі крэпка ушэмлена Бэльгійцамі і да расправы с Французамі астаецца фронт і левае крыло. Дагэтуль вайна паміж Нямеччынай і Францией адбываецца на Бэльгійскай зямлі і ў правінціях Альзаціі і Лотарынгіі належачых да Нямеччыны. На французскую зямлю Немцы ступілі толькі на маленькім кавалачку каля гораду і крэпасьці Нансі, каторы ляжыць у кутку, каля Швайцарыі.

Адным словам цяперэшняя вялікая бітва, што кіпіць на Захадзе ня будзе бітвай разстрыгаючай, а толькі дасць аднэй каторай небудзь старане, у агульным падрахунку, часовые карысці або страты. Разстрыгаючая бітва, як з гэтаго відаць, наступіць пазьней, калі абедзьві ваюючые староны, болей сціснуць фронт і гэтым самым болей згусцяць свае сілы супроць сябе.

# ВАЙНА.

### Расейска-Нямецкая.

У панядзелак 4 жніўня каля Більдэрвэйнена і Стапульнена, нідалёка ад расейскай мытнай каморы (таможні) Вержбалова, была сур'ёзная бітва паміж нашымі вайскамі і Немцамі. Пасьля гарачай схваткі нашае войска захапіло 7 гармат, 12 скрынак з набоямі, 2 пулямёты і многа палону. З бою узяты нашымі нямецкіе мястэчкі Мелькенен і Ковален.

— У сераду 6 жніўня нашэ войска узяло нямецкіе гарадкі Сталупен і Лык. Немцы адступілі.

— Гэтаго-ж дня наша армія, пастаянна б'ючыся, пастпала уперад у старану нямецкаго гораду Гумбінена, каторы ляжыць у Усходняй Прусіі, на захад ад Вержбалова, каля 100 вёрст ад нашай граніцы.

— У чэцьвер 7 жніўня бітва кіпела на фронцэ у шыркі да 30 вёрст. У гэтай бітве прыймало учасьце ня менш 14 пяхотных нямецкіх палкоў і многа цяжкой артылерыі. Наша конніца захапіла 2 гарматы.

— У суботу 9 жніўня штаб вярхоўнаго глаўнакамандуючаго наведаміў:

Бітвы у Усходняй Прусіі 4, 5, 6 і 7 жніўня адбываліся з вялікай зацятасцю. Дух у войску бадзёры. Фронт бітвы расцягіваецца на 40 вёрст. Нямецкіе гарады Гольдат і Арыс узяты намі. Атступленьне 20 нямецкаго корпуса з ваколіц Лык мело дужа пасьпешны характар. У Лыках захоплены паравоз і служачые, запасы пошыру, спірту, бэнзіны. У казначэйствы сконфіскавана (забрана на карысць нашых) 50 тыс. марак (нямецкіе грошы: Марка каля 50 кап.). Каля Віленбэрга непрыяцельскае войска ачышчае граніцу. Немцы жыхары пакідаюць сялібы і уцекаюць на поўнач у глыб Нямеччыны.

У нядзелю 10 жніўня са штабу вярхоўнаго глаўнакамандуючаго паведамлялося: наступленьне у Усходнюю Прусію 10 жніўня трывало на шырокім фронце.

Нямецкае войска адступае за рэку Ангерапп, перэправа праз каторую пад Даркеймамі знаходзіцца у руках расейскаго войска. На захад ад мазурскіх азёр расейскае войска заняло гарады Еганісбург, Ортэльсбург, Віленсбург і Сольдаў. Жыхары гарадоў паўцекалі.

### Расейска-Аустрыяцкая.

У панядзелак 4 жніўня а 7 гадзіне раніцай пятая аўстрыяцкая пяхотная дывізія, атціснуўшы нашы раз'езды аттакавала мястэчка Красьнік, Люблінскай губэрніі. Усяго Аўстрыякі развінулі да тро. палкоў пяхоты і чатыры батарэі. Пасьля прыходу падмогі, нашае войска адбіло непрыяцельскі ахват, перайшло у наступленьня і узяло у палон 6 афіцэроў і каля 250 салдатоў. Бітва закончылася а палавіне восьмай гадзіны вечэрам. Ноччу Аўстрыякі пасьпешна адступілі. Страты непрыяцеля дужа вялікі.

Каля Гарадка (Падольск. губ.), на паўночна-захадзі ад Гусятына, аўстрыяцкая кавалерская дывізія (конніца) пасьля пяцігадзіннай бітвы атступіла у непарадку ціснутая казакамі.

На поўдзень ад Збаража наша конніца пасекла непрыяцельскую пяхоту, папсавала непрыяцельскі тэлеграф, варочаючыся выбіла непрыяцельскую роту с Краснасельцоў, запаліла блокгаўзы, захапіла прылады і крыху аружжа. Гэткая-ж самая шчасьлівая аттака нашай конніцы была у Каростаўцы.

— У чэцьвер 7 жніўня нашае войска на палудзенным фронце, перайшоўшы рэку Збруч, перакінулося на аўстрыяцкую зямлю.

Нідалёка ад Берастэчка, каля Новастава, нашае войска загнало у балота эскадрон дзевятаго гусарскаго аўстрыяцкаго палка. Здаліся у палон два афіцэры і 105 гусароў. Аўстрыяцкі батальён выбіт з Равы—расейскай.

### Французка-Нямецкая.

Французскі генерал Жофр паведамляе: за апошніе дні французам у Альзаціі і Лотарынгіі ручыло. Нямецкае войска мело усюды не малые страты. У вышняй Альзаціі немцы атступалі у непарадку, пакідаючы усюды раненых і ваенные прыпасы.

Упанядзелак 4 жніўня, днём нямецкае войска шпарка атступіло перэд наступаючым французскім войскам. Французы займаюць усю ваколіцу вазёр на захад ад Фэтэнранжа і выступаюць з даліны рэкі Сэль, с часьці каторай нямецкае войска ужо выступіло.

У сераду 6 жніўня вялікіх перамен у Альзаціі не было, хоць французы і пасуваюцца памалу уперад. У вышняй-жэ Альзаціі немцы ізноў узялі мястэчка Вільле v Вогезскіх горах.

У пятніцу 8 жніўня французскае ваеннае міністэрство паведаміло, што французскае войска атрымало бліскучую пабеду над Немцамі паміж Мюльгаўзэнам і Альткірхенам. Немцы адступаюць да рэкі Рэйна, пакідаючы вялікі палон. Захоплена 24 гарматы.

— 7 жніўня дзень быў меней шчасьлівы для французоў. Французскіе пярэдніе атдзелы наткнуліся на дужа крэпкіе пазыціі. Бой быў дужа гарачы. С прычыны чысьленнай перэвагі немцоў, французскае войска, біўшаеся, шэсць дзён без перарыву было адведзена назад. Левае крыло французскай арміі прыкрывае пярэдніе акопы французскай крэпасьці Нансі, што ляжыць каля самай нямецкай граніцы адзеляючай Лотарынгію ад Франціі.

— Нядзеля 10 жніўня. Паводле чутак гэтаго дня раніцай, паміж Намюрам і Шарлерой пачалася вялікая бітва паміж арміей французскай і нямецкай

— С Копэнгагі паведамляюць, што французы шпарка напіраюць на нямецкі горад Страсбург, пярэдніе аддзелы французскай арміі знаходзюцца у адлегласьці каля 30 вёрст ад крэпасці.

У панядзелак 11 жніўня. Вялікая бітва што пачалася паміж Французамі і Немцамі адбываецца з вялікай зацятасцю на усім фронце, паміж рэкой Мозэль і Монсам. Страты з абодвых старон ужо дужа вялікі. Увесь сьвет нецярпліва чэкае вестак аб выніку гэтай вялікай бітвы.

### Бэльгійска-Нямецкая.

У аўторак 5 жніўня пачалася вялікая бітва паміж Немцамі і Бэльгійцамі. Жыхары места Тірльмона уцекаюць у сталіцу Бэльгіі Бруссэль.

— У сераду 6 жніўня Немцы наступалі ўздоўж усяго фронту (перэду арміі) с поўначы на поўдзень.

— У чэцьвер 7 жніўня бэльгійская полевая армія, аттакаваная немцамі каторые перэвышалі чыслом бэльгіўцоў, атступіла. Пачынаючы с самай раніцы зносіны с Брусэлям, сталіцай Бэльгіі, сталіся труднымі. Бэльгійскае войска дужа добра выпоўніло сваю павіннасць, каторая была у тым каб стрымаць непрыяцельскае наступленьне, каб даць змогу хаўруснікам без перашкоды сабраць свае сілы. Атступленьне Бэльгійцоў чэканае ад некалькі дзён, выплывае с планоў стратэгічнага характару.

Публіка з нецярпеньнем жджэ вестак аб разстрычаючай вялікай бітве, каторая адбываецпа у Бэльгіі. Пакуль што нічога не вядома, апрача вестак апублікаваных французамі у каторых гаворыцца аб тым што хаўрусніцкае войска (француска-бэльгійскае) знаходзіцца у лепшых варунках.

— У пятніцу 8 жніўня кавалерыя нямецкая заняла горад Бруссэль. Бэльгійская армія адыйшла да Антвэрпэна недапушчаючы да сябе непрыяцеля. Антвэрпэн ляжыць на поўнач ад Бруссэля, каля мора, гэта дужа крэпкая Бэльгійская крэпасць.

Англіцкае правіцельство апублікавало паведамленьне аб палажэньні у Бэльгіі. З гэтаго павядамленьня відаць, што бэльгійская армія адступіла каб абараніць свае зносіны с крэпасьцю Антвэрпен. Правіцельство бэльгійскае перанесено з Бруссэля у Антвэрпен. Заняцьце Бруссэля немцамі ні мае вялікаго значэньня. Палажэньне бэльгійскай арміі грaзіць праваму крылу немцоў, калі яны будуць далей ісці на захад.

— У суботу 9 жніўня атступленьне бэльгійскай арміі ішло без задзержкі. Нямецкая кавалерыя перэйшла праз Бруссэль кіруючыся на захад. За ей пастпае корпус нямецкай арміі. Рух нямецкаго войска на захад ідзе па абодвых берэгах рэкі Мааса.

### Сэрбска-Аустрыяцкая.

— 4 жніўня у панядзелак сэрбскае правіцельство апавесціло, што аўстрыяцкае войска дагэтуль ешчэ не здабыло места Белграду, сталіцы Сэрбіі. Аўстрыякі што дзень стрэляюць у место з гармат, але шкоды дагэтуль зрабілі мала.

— У ауторак 5 жніўня Сэрбы каля сялібы Шабац разбілі вялікую партію аўстрыяцкаго войска, здабылі 14 гармат.

— У чэцьвер 7 жніўня была гарачая бітва паміж Аўстрыей і Сэрбіей каля Лозніцы. Бітва закончылася перамогай Сэрбоў. Непрыяцель разбіты і атступае ва ўсіх кірунках, пасьпешаючыся да-

пасьці мастоў на рэцэ Дрыне. Пры атступленьні Аўстрыякі пакінулі багатую дабычу Сэрбам. Захоплена 40 аўстрыяцкіх гармат, многа палоненных афіцэроў і салдатоў, шмат ваенных прыпасоў і коней, палявые лазарэты з усімі матэрьялами і людзьмі. Аўстрыяцкіе страты вялікі. Саўсім зніштожэны цэлые палкі.

### Чэрнагорска-Аустрыяцкая.

У аўторак 5 жніўня Аўстрыякі аттакавалі вялікімі сіламі фронт (перад) чорнагорскаго войска каля Грахова. Бітва цягнулася цэлы дзень. Непрыяцель адбіты па ўсяму фронту і атступіўся пакінуўшы многа забітых і раненых. Чорнагорскіе страты не вялікі.

У суботу 9 жніўня прывязьлі у сталіцу Чорнагоры Цэтыньне паланёных 11 аўстрыяцкіх афіцэроў 132 матросоў, узятых каля Будвы, занятый Чорнагорцамі

## Палажэньне у Эуропе.

— — —

З 19 большых гасударстваў Эўропы дзевяць ужо уцягнуты у вайну: Расея, Францiя, Англія, Бэльгія, Сэрбія, Чорнагорыя, Голяндія, Нямеччына і Аўстрыя, а другіх 10 гасударстваў: Італія, Турція, Швэція, Норвэгія, Данія, Гішпанія, Португалія, Румынія, Боўгарыя і Швайцарыя стаяць у старане, ці як па загранічнаму кажуць—трымаюцца нэўтралітэту.

Дужа быць можэ, што гэтые нэўтральные гасударствы да канца вайны не ўтрымаюцца у старане і прылучуцца такжэ да вайны, тым больш, што кожная с хаўрусных ваюючых старон стараецца перэцягнуць сабе у помач ешчэ і ешчэ хаўрусьнікоў.

І вось, як чуваць з газэт, найболей цяпер стараюцца ваюючые стороны аб Італію. «Русск. Сл.» пішэ, што нямецкае правіцельство выслало у Рым (сталіца Італіі) сваіх дыпломатоў каб паспробавалі ешчэ раз зьеднаць Нямеччыне Італію. Але там нямецкіе дыпломаты, як чуваць, засталі ужо ангельскіх дыпломатоў с каторымі італьянцы рабілі нейкіе угаворы на карысць проці нямецкаго хаўрусу. Як відаць італьянцы і с тымі і с тымі гаворуць і ў той-жэ самы час ладзюцца да вайны. Апошніе весткі што прынёс тэлеграф былі аб тым, што італьянцы збіраюць дамоў усе свае караблі. Скарэй за усё, а прынамсі так усе гадаюць, што Італія пойдзе разам з Англіей і Францiей.

Португалія доўга надумлялася куды прыстаць, але у канцы португальскі прадседацель рады міністроў тэлеграфаваў у Англію, што Португалія гатова выступіць проці Нямеччыны, на першае жаданьне Англіі.

Кароль Гішпанскі гэтак сама абсудзіўшы і абдумаўшы палажэньне бадай што згодзіцца ўступіць у хаўрус с Францiей і Англіей.

У Турціі утварыліся дзьве партіі: адна пад кірункам Энвэр-пашы і Талят-бэя хочуць уцягнуть Турцію у вайну за адно з Нямеччынай і Аўстрыей, а другая партія с прадседацелям міністроў і міністрам фінансоў хочэ каб Турція саўсім не мешалася у вайну. Каторая партія перасіліць пакуль што нет ведама. С тэлеграфных вестак вядома толькі, што у Турціі адбылася мобілізація і ваенная ведамство пасьпешна скупляе хлеб у пагранічных аколіцах Пэрсіі.

Боўгарыя і Румынія паміж сабой робюць нейкую угоду. Кажуць, што пасол румынскі выехаў у Боўгарыю, каб дабіць торгу. Чуваць што Румынія саўсім згодна с Пецярбургам.

Галяндзія паспешна збірае войска на Бэльгійскую граніцу, каб бараніць сваей нэўтральнасці.

І вось, як дагэтуль можна мяркаваць, апрыча тых государстваў каторые ужо папалі у вір вайны, іншые гасударствы найболей стараюцца аб тое, каб забаспечыць сваю неўтральнасць, або выказаць сваю прыхільнасць старане дужэйшай, гэта значэ хаўрусу Расеі, Франціі і Англіі.

## Аб усім па трохў.

— — —

### Насяленьне Эуропы.

Дырэктар францускаго статыстычнаго інстытуту нідаўна апублікаваў апошніе акуратные падлічэньня насяленьня розных дзержаў Эўропы. Гэтые цыфры асабліва цікавы у цяперэшні час, дзеля таго што большая часць Эўропы захоплена пажарам вайны, а тые гасударствы, каторые дагэтуль нэўтральны (трымаюцца у старане), у залежнасці ад ходу здарэньнёў могуць быць уцягнуты у агульны вір, нават паміма сваей ахвоты, як гэта напрыклад сталося з Бэльгіей і Голяндзіей, с прычыны пагвалчэньня іхняго нэўтралітэту Нямеччынай.

Чысьленнасць народанасяленьня:

| | | |
|---|---|---|
| Нямеччына | 66,100 | тыс. |
| Англія | 45,700 | » |
| Аўстро-Вэнгрыя | 50,100 | » |
| Бэльгія | 7,600 | » |
| Боўгарыя | 4,400 | » |
| Данія | 2,800 | » |
| Гішпанія | 20,200 | » |
| Францыя | 39,700 | » |
| Італія | 35,200 | » |
| Норвэгія | 2,400 | » |
| Голяндзія | 6,100 | » |
| Португалія | 6,100 | » |
| Румынія | 7,200 | » |
| Эўроп. Расея і Фінлян. | 121,800 | » |
| Сэрбія | 2,900 | » |
| Швэція | 5,600 | » |
| Швайцарыя | 3,800 | » |

## З Беларусі і Літвы.

— — —

### Мінск.

У Мінску злажыўся камітэт грамадзянскай помачы бедным семьям запасных чыноў і апалчэнцоў узятых на вайну. У камітэт увайшлі прэдстаўнікі усіх націй і праўленьне выбрана такжэ с прэдстаўнікоў усіх націй. Заклік камітэту надрукаваны на чатырох мовах—па расейску, па польску, па беларуску і па жыдоўску.

— Губэрнатар мінскі прыпыніў высяленьне жыдоў з вёсак, а такжэ і ўсе судовые позвы на жыдоў аб незаконным торгу і арэндзі зямель.

### Пажар.

У вілейскім павеці згарэло мястэчка Гарадок. 500 душ асталося без прыпынку. Страты больш як на 116 тысяч рублёў.

## З усіх старон.

— — —

### Скон Акімова.

9 жніўня вечэрам памёр прадседацель Гасударственнай Рады статс сэкрэтар Акімов.

### Закрыцьцеся правых арганізацій.

Пецярбурскіе газэты пішуць, што глаўная палата Міхаіла Архангела на увесь час вайны закрываецца. Маецца закрыцца такжэ і «саюз рускіх людзей».

### Спын позвоў на жыдоў.

Перэдаюць, што са згоды міністра ўнутрэнных спраў, міністр судоў загадаў да часу спыніць усе судовые справы аб прысваеньні жыдамі хрысціянскіх імён і аб парушэньні імі закону а праве жыхарства.

### Праезд семей запасных.

Правіцельство пазволіло на дармовы праезд у вагонах III і IV клясы, па казённых і прыватных жалезных дарогах, бедным семьям запасных чыноў і апалчэнцоў, каторые вертаюцца на бацькоўшчыну. З гэтай льготы маюць права карыстаць і бедные асобы выселяные с крэпасьцей і аколіц ваеннаго дзейства.

### Ахвяры на ваенные патрэбы.

С першых дзён вайны з усіх старон, ад асобных людзей, грамадзкіх арганізацій і установ пасыпаліся багатые ахвяры у ваенное ведамства на патрэбы вайны, а найболей на чырвоны крыж, для раненых і на падмогу семьям узятых на вайнў запасных чыноў. Пецярбурскае тэлеграфнае агенства паведамляе, што толькі за адзін дзён, 6 жніўня, розные установы ва усей Расеі злажылі на падмогу раненым хворым воінам ды семьям запасных 3,728,690 руб. і за гэты-ж дзён устроена лазарэты на 552 хворых. Маскоўскі біржэвы камітэт асыгнаваў 5 мільёноў 100 тысяч грошы, за каторые арганізуе лазарэт на 3 тыс. ложак, санітарны поезд і шыцьцё бялізны для хворых. Маскоўскіе дваране арганізуюць 35 санітарных поездоў і бяруць на свой кошт пад апеку 1,200 раненых, каторым манастыры будуць выдаваць па 12 руб. кожнаму у месяц. Кіеўскае губэрнскае земство асыгнавало 300 тыс. руб. на раненых і хворых і 130 тыс. руб. для семей запасных і т. д. і т. д.

### Падбухторываньне проці Расейцоў.

У адным з маскоўскіх лазарэтоў ёсць двое раненых нямецкіх салдатоў. Яны ужо выздараўліваюць. Старшый доктар расказывае, што калі нямецкіх салдатоў прывязлі, то яны увесь час дрыжэлі ад страху. З гутарак з імі доктар даведаўся, што у Нямеччыне салдатам угаварываюць не здавацца расейскім дзікуном, дзеля таго, што усё роўна іх у палоне замучаюць. Раненые здзіўлены добрым даглядам за імі і увесь час дзякуюць.

## З заграніцы.

—о—

### НОВАЯ ВАЙНА.

**10 жніўня Японія абвесціла вайну Нямеччыне.**

### Японія граціць вайной Аустрыі.

Японскі пасланнік у сталіцы Кітаю Пэкіне, сказаў што калі аўстрыяцкі карабель каторы стаіць цяпер каля Кітаю, будзе бараніць Немцоў, то Японія будзе прымушэна абвесціць вайну і Аўстрыі.

### Утрата Нямеччынай купецкай флоты.

Не глядзя на тое, што ад пачатку вайны прайшло усяго толькі два тыдні с чымсь, с 635 нямецкіх купецкіх караблёў, каторые былі у аткрытым моры, 200 ужо захоплена.

### Перэд развалам.

Аўстрыяцкі глаўнакамандуючый эксгерцог Фрыдрых надрукаваў паперу, у каторай апавешчае польскім каралём, каралеўства польскаго, свайго сваяка, эксгерцога Карла-Стэфана, жэнатаго є дачкой князя Радзівілла.

### Ваенная контрыбуція.

Немцы налажылі на правінцію Льеж ваенную контрыбуцію у 50 мільёноў франкоў і на горад Брусэль у 200 мільёноў франкоў.

## Сьмерць Папежа.

—о—

У чэцьвер 7 жніўня памер Папеж Піус X. Каля поўдня 7 жніўня Папеж утраціў мову, але ешчэ пазнаваў быўшых там, вечэрам гарачка дайшла 40 градусоў. Папеж памёр, а гадзіне 1 і мінут 20 па поўначы. Памершы Папеж радзіўся у 1835 гаду 2 чэрвеня у беднай італьянскай вёсцы Рэзэ, лежачай нідалёка ад Вэнэціі. У 1903 гаду 4 жніўня быў выбран на папежа. Папежам быў 11 гадоў.

### Сьмерць генерала Езуітоу.

У чэцьвер 7 жніўня памер генерал Езуітоў ацец Францішк-Ксавэры Вэрнц.

Рэдактар-Выдавец

І. Луцэвіч.

## Агляд кніг.

**Родные Зьявы**, зборнік апаведаньнеў *Тараса Гушчы.* Вільня, 1914 г., 240 стр., 8°, цэна 60 кап.

**Рунь**, зборнік апаведаньнёў *М. Горэцкаго.* Вільня, 1914 г., 136 стр., 8°, цэна 40 кап.

**Курганная Кветка**, зборнік вершоў *Констанціі Буйло.* Вільня, 1914 г., 88 стр., 8°, цэна 25 кап.

**Якім Бяздольны**, апаведаньне *Пётры Беларуса.* Вільня, 1914 г., 54 стр., 8°, цэна 15 кап.

Усе кніжкі выдало Беларускае Выдавецкае Таварыство у Вільні, маюць прыгожые, з рысункамі вокладкі, і надрукованы на добрай таўстой паперы. Глаўны склад, дзе можна купляць і выпісываць: **Беларуская Кнігарня**, *Вільня, Завальная, 7.*

Вышоў з друку першы нумэр часопісі:

**„РАНІЦА“**

Думкі беларускай студэнцкай моладзі.

ЗМЕСТ № I.

**Нашые шляхі**—Карпа Гол-скі.
**Азірнемся**—Л. Будзіловіч.
**Ні пакідайце сваей мовы**—Тарас Язычнік.
**Праца і навука**—К. Д.
**Да таварышоў, каторые канчаюць сярэдніе школы**—К. Д.
**Казка аб крыльях.**—Лаўрэн. Будзіловіч.
**Беларуская ідэя і рух Беларускі паміж студэдтамі.**—К. Д.

Адрэс рэдакціі: Пяцярбург 4 лінія 45—16 для „**РАНІЦЫ**“.

**Цэна асобнаго нумэру 10 кап.**

Выпісываць можна з „Беларускай Кнігарні“ Вільня, Завальная № 7.

Друкарня Мырціна Кухты, Татарская 20.